# Афіцыйнае адкрыццё выставы ТІБО- 2017 адбудзецца 18 красавіка ў 12.00

XXIV Міжнародны спецыялізаваны форум па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях "ТІБО" пройдзе ў Мінску з 18 па 21 красавіка.

У гэтым годзе ў выставе прымуць удзел больш за 100 кампаній, якія прадстаўляюць прадукцыю з 17 краін свету (Беларусь, Расія, Украіна, Казахстан, Азербайджан, Літва, Латвія, Польшча, Чэхія, Германія, Аўстрыя, Фінляндыя, Швецыя, Кітай, Паўднёвая Карэя, Японія , ЗША).

Сярод удзельнікаў выставы вядучыя аператары фіксаванай і мабільнай сувязі: нацыянальны аператар РУП «Белтэлекам», СТАА «Мабільныя ТэлеСістэмы», ЗП «Велком», ЗАТ «БеСТ», СТАА «Беларускія хмарныя тэхналогіі»; кабельныя аператары СП «Космас-ТБ» і ААТ «МТІС»; аператар паштовай сувязі РУП "Белпошта".

На выставе прадстаўлены сусветныя брэнды: Huawei, Nokia Networks, ZTE, Canon, Epson, Samsung, Motorola, Eaton і іншыя.

Будзе прадэманстравана прымяненне найноўшых тэхналагічных рашэнняў у самых розных сферах, такіх як сельская гаспадарка, банкаўскі сектар, прамысловасць, ахова здароўя, тэлекамунікацыі, адукацыя, грамадская бяспека, транспарт, а таксама выкарыстанне сістэм "разумны дом" і "разумны горад".

Нароўні са стэндамі асобных прадпрыемстваў на "ТІБО-2017" будуць працаваць калектыўныя стэнды Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, Мінгарвыканкама, Міністэрства прамысловасці, Парку высокіх тэхналогій, а таксама стэнды Азербайджана, Літвы, Латвіі. У праграму ўключаны таксама спецыялізаваныя мерапрыемствы па асноўных напрамках, вызначальным поспех лічбавай трансфармацыі: нарматыўна-прававым і нарматыўна-тэхнічным забеспячэнні, бяспекі і інавацыям.

Азнаёміцца з больш падрабязнай інфармацыяй можна на афіцыйным сайце

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/17-04-2017-1874*